знайшоў Сапраўднае Сваё, Сапраўднае Шчасце – Царства Нябеснае. Глыбокі біблейскі сэнс закладзены і ў прыпавесці Якуба Коласа. Для Бога важны кожны чалавек. Ён жадае, каб кожны быў выратаваны і ўвайшоў у Царства Божае. Чалавек можа доўга блукаць, доўгі час быць вельмі і вельмі далёкім ад Бога. Але Айцец Нябесны заўсёды побач і ў пэўны момант знаходзіць той адзіны здатны выпадак, каб вярнуць грэшнага чалавека да Сябе і падарыць яму Выратаванне праз служэнне Свайму.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Біблія: кн. Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету: кананічныя / у беларус. пер. В. Сёмухі. – Duncanville (USA): World Wide Printing, 2002. – 1535 с.
2. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд / пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск: Вышэйш. шк., 1998. – 351 с.
3. История человечества / под ред. А. Х. Дани и Ж.-П. Моэна. – UNESCO, 2003. – Т. 2: III тыс. до н. э. – VII в. до н. э. – 606 с.
4. Колас, Я. Новая зямля. Казкі жыцця: паэма, апавяданні / Я. Колас; прадм. У. Казберука. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 374 с.
5. Поэзия и проза Древнего Востока / общ. ред. и вступ. ст. И. Брагинского. – М.: Худож. лит., 1973. – 734 с.
6. Уайт, Е. Притчи Иисуса Христа / Е. Уайт; пер. с англ. – Заокский: «Источник жизни», 2007. – 352 с.
7. Хрестоматия по истории Древнего Востока: учеб. пособие: в 2 ч. / под ред. М. А. Коростовцева, И. С. Кацнельсона, В. И. Кузищина. – М.: Высш. шк., 1980. – Ч. 1. – 328 с.


*УДК 821.161.3.09(092)Купала*

## ЭСТЭТЫКА СІМВАЛА Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ: РЭЦЭПЦЫЯ, ВОБРАЗНА-ВЫЯЎЛЕНЧАЯ ПРЫРОДА, КАНТЭКСТ

**Т. Б. Мацюхіна**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*tata2xa@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца творчая спадчына нацыянальнага беларускага паэта Янкі Купалы ў кантэксце сімвалізму. У працы падчас аналізу вершаў айчыннага класіка літаратуры вызначаюцца перадумовы ўзнікнення сімвала і раскрываюцца ягоныя спецыфічныя рысы. Асэнсаванне рэчаіснасці скрозь прызму ўспрымання Янкі Купалы дае магчымасць сучаснаму чытачу асэнсаваць тыя эстэтычныя задачы, якія паэт увасобіў у сваёй творчасці.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; сімвал; рэцэпцыя; Якуб Колас; рэфлексія.

## AESTHETICS OF THE SYMBOL IN THE WORK OF YANKA KUPALA: PERCEPTION, FIGURATIVE NATURE, CONTEXT

**T. B. Matsiukhina**

*The Centre for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches*
*of the National Academy of Sciences of Belarus*
*Minsk, Republic of Belarus*
*tata2xa@mail.ru*

The article examines the creative heritage of the national Belarusian poet Yanka Kupala in the context of symbolism. In the work, during the analysis of the poems of the Belarusian classic of literature, the prerequisites for the emergence of the symbol are determined and its specific features are revealed. Comprehension of reality through the prism of Yanka Kupala's perception makes it possible for the modern reader to comprehend those aesthetic tasks that the poet embodied in his work.

*Key words:* Yanka Kupala; symbol; reception; Yakub Kolas; reflection.

Як вядома, творчасць беларускага песняра Янкі Купалы прасякнута прыкметамі рэалізму і неарамантызму, імпрэсіянізму і сімвалізму. У літаратурным сімвалізме асацыяцыі, якія фарміруюцца ў працэсе ўспрымання мастацкага твора, суадносяцца з вобразамі і перажываннямі, эмацыянальна «неапрацаванымі» ўражаннямі, што ўзнікаюць у падсвядомасці чытача. Паводле меркавання І. Гарына, «сімвалізм ёсць спалучэнне двух парадкаў паслядоўнасцей: паслядоўнасці вобразаў і паслядоўнасці перажыванняў, якія выклікаюць стварэнне вобраза» [4, с. 72]. Для Янкі Купалы характэрныя сімвалы, звязаныя між сабой лінейнай, ланцужковай асацыятыўнай сувяззю (крыж – у вершы «Крыжы»; гуслі – у паэме «Курган»).

Бясспрэчна, «сімвал – знак ці прадмет, які замяшчае іншы прадмет і выражае цэлую сістэму ідэй» [1, с. 400], з'явіўся яшчэ ў старажытныя часы і паступова, з утварэннем абшчын і фарміраваннем зародкаў грамадства набываў усё новыя ўласцівасці і адзнакі. Спачатку ў цэнтры ўвагі былі простыя назвы прадметаў, рэчаў, з'яў у іх прамым значэнні. Пазней, з узнікненнем асацыятыўнага і метафарычнага мыслення, назвы сталі ўспрымацца ў пераносным значэнні – дзякуючы выкарыстанню метафары, метаніміі, параўнання і г. д. Аднак сімвал нельга атаясамліваць са знакам ці эмблемай. Сам сімвал можа мець мноства значэнняў і набываць разнастайныя стылістычныя адценні слова: «…Раніцамі сее [вясна. – *Т. М.*], // Як брыльянты, росы. // Сцелецца травіцай, // Ветрыкам шапоча, // Коціцца крыніцай, // Рыбкаю плюскоча» [8, с. 301]. А знак, эмблема, як правіла, маюць толькі адно значэнне: «І усюдых гэтак – // Полем, сенажацяй, // У кароне з кветак, // У святлянай шаце» [8, с. 302].

Паводле класіфікацыі аўтара кнігі «Ад тэксту да хранатопу» П. Васючэнкі, у творчасці Янкі Купалы вылучаюцца наступныя сімвалы: лакальныя, спарадычныя і ўніверсальныя [3, с. 19]. Сярод іх звяртаюць на сябе ўвагу такія агульнапрынятыя і кантэкстуальна значныя, ці ўніверсальныя, як доля, шчасце (верш «Дзяўчынцы», паэма «Адвечная песня»). Відавочна, уся Беларусь на бяскрайніх прасторах, у любым яе куточку для Янкі Купалы з'яўляецца домам. Асветніцкая ідэя паяднанасці лёсу чалавека і родных мясцін бярэ пачатак яшчэ ў часы першадрукара Ф. Скарыны. Нездарма вышэйзгаданы даследчык сімвалізму падкрэслівае: «У разгалінаванай сімволіцы, створанай Скарынам у ягоных «Прадмовах» і «Пасляслоўях», асаблівай канцэптуальнасцю вылучаецца вобраз Радзімы, пададзены праз артэфакт дому <…>» [2, с. 37].

Сярод сімвалаў Янкі Купалы сустракаюцца і фальклярызаваныя (папараць-кветка ў вершах «Заклятая кветка», «На Купалле»; сокал у вершы «І вецер, і сокал, і я...»; ваўкалак, лясун у вершы «Хохлік»), нацыянальныя, спрадвечна беларускія (насып-курган у вершы «Курган»; дуб у аднайменным вершы), агульнаўжывальныя, характэрныя для ўсіх народаў (пуціна ў вершы «З табою…»).

Зразумела, што «сімвал – не толькі мова міфа, але і знак мастацтва ўвогуле» [4, с. 72]. Сімвал мастацкі і алегорыя адрозніваюцца і па сваёй структуры, і па знешніх уласцівасцях. Абодва віды ўмоўна-іншасказальнага абазначэння прадмета, з'явы раскрываюць пазнавальную і камунікатыўную функцыі літаратуры. Аднак менавіта дзякуючы мастацкаму сімвалу вырашаюцца эстэтычныя задачы, пастаўленыя ў тэксце Янкам Купалам, – ствараць уяўленне пра мастацкі канон і ўплываць на літаратурны густ чытача.

Янка Купала адухаўляе архетыповыя, спрадвечныя вобразы – зямлі (вершы «Як пайду я, пайду...», «Бацькаўшчына») і неба (вершы «У вырай!», «Мая думка»), якія ў кантэксце мастацкага твора набываюць уласцівую ім першаідэю аб прысутнасці ва ўсім Боскага пачатку. Духоўнасць і дэградацыя грамадства з'яўляюцца цэнтральнай праблемай у творчасці нацыянальнага паэта Беларусі (паэма «Сон на кургане», вершы «Там», «Гусляр», «Песня званара»). Дзякуючы мастацкаму сімвалу Янка Купала вымалёўвае характары герояў (Бандароўна ў аднайменнай паэме; Данілка са скрыпкай у драме «Раскіданае гняздо»).

Айчынны класік фарміруе ў мастацкай прасторы вобразы-сімвалы на аснове асэнсавання з'яў рэчаіснасці пачатку ХХ ст. (становішча працоўных мас, заняпад вёскі) і грунтуецца пры гэтым на паняццях «трагічнага», «трансцэндэнтальнага» і «сакральнага». Нездарма тэарэтык сімвалізму Л. Кабылінскі адзначае: «метадам творчасці сімвалістаў [па Ш. Бадлеру. – *Т. М.*] служыць устанаўленне бясконца-тонкіх і складаных радоў адпаведнасцей <…> паміж з'явамі бачнага свету, унутранымі перажываннямі паэта, якія адпавядаюць "вышэйшым планам" акультызму» [6, с. 21].

Янка Купала нярэдка звяртаецца да сімвала ў паэзіі, драматургіі, каб падкрэсліць шматграннасць, унікальнасць вобраза-характару, вобраза-тыпу (лірычны герой з верша «Мая малітва»; князь-уладар з паэмы «Курган»). Высокая ступень успрымання ягонай творчасці чытачом тлумачыцца зваротам літаратурнага творцы да эмацыянальнай рэфлексіі – «перажывання, г. зн. асэнсавання ўражанняў, успамінаў, эмацыянальнай рэакцыі» [5, с. 23]. Сугестыўнасць, музычнасць вершаў Янкі Купалы ў пэўнай ступені абумоўліваецца вобразна-выяўленчай прыродай сімвала і асацыяцый. Так, у вершы «Рэчка» Янкі Купалы ствараецца карціна плёскату вадзіцы ў рэчцы. Узнікаюць яркія асацыяцыі, звязаныя з гарманічнай сутнасцю наваколля і ачышчальным спакоем у душы, прыналежнасцю да свайго краю: «Між гор – далінаю – за вёску <…> // Бяжыш ты, рэчка, і бяжыш. // Падгоніш каменьчык жвіровы, // Травінку водную трасеш, // Чапаеш караньчык альховы, // Па верху кветачку нясеш» [7, с. 69–70]. А праз вобраз рэчкі раскрываюцца тонкія адчуванні лірычнага героя – пры сузіранні падводнага свету – і выяўляецца ягоны настрой, нават канцэпцыя мыслення: «…Я – капля ў моры; толькі ж мора // Маё ад дум тваіх святлей!..» [7, с. 70].

У паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа мноства сугуччаў у плане вобразнасці, сімволікі. У той час як ва ўспрыманні і разуменні Янкі Купалы белы чысцюткі снег – сімвал замірання жыцця, скону, смерці (вершы «Зіма», «Зазімак», паэма «У Піліпаўку»), для Якуба Коласа снег – носьбіт ачышчэння душы і свету (вершы «Надыход зімы», «Дзед-госць», «На гасцінцы»).

Святло, колер, інтанацыя, рытм і рыфма з'яўляюцца сэнсавызначальнымі складнікамі ў разнапланавай па тэматыцы паэзіі, драматургіі Янкі Купалы. Празрыста-светлыя і насычаныя цёмныя колеравыя характарыстыкі ў ягонай лірычнай спадчыне ўвасабляюцца ў рытмарадах, дзе «сонца косы» сімвалізуюць ярка-жоўты, а «кветкі нябесны» – светла-сіні колер (верш «Вячэрняя малітва»). Відавочна, «колеравая музыка», ці спалучэнне ў вобразе паняццяў «колеру» і «гуку», спарадзіла ўважлівае стаўленне чытача да філасофіі інтуітывізму. У беларускай літаратуры XX ст. візуальнае і аўдыяльнае ўспрыманне свету паўплывала на творчасць Янкі Купалы: «Як летняе сонца свае згасіць косы // І кветкі нябесны зайграюць нясмела, – // Ноч сее тады серабрыстыя росы, // Над логам звісае туманнай пабелай» [7, с. 80].

Як адзначае Я. Клімуць, «эстэтычныя адносіны ўяўляюць сабой эмацыянальную рэфлексію (адлюстраванне)» [5, с. 23]. Візуальная прырода мастацкіх твораў Янкі Купалы мае пэўнае дачыненне да абстракцыі, вынайдзенай у рэальнасці і пераасэнсаванай у канкрэтны час і ў канкрэтным месцы, але выказанай на мове эзатэрычнай і незразумелай шырокаму колу чытачоў. Аўдыяльная ж прырода мастацкіх твораў у творчасці аўтара тлумачыцца сугестыўнымі магчымасцямі пісьма, ірацыянальнай уласцівасцю вобраза-сімвала: «Ночна-сонная даль мае мову сваю, // Былі з'яўныя шорахам тайным складае, // Песню з небам снуе – праслаўляе зямлю; // Ў песню лучыцца гэту душа маладая» [7, с. 94].

З прычыны таго, што «творы сімвалізму сугестыўныя і здольныя аказваць унушальнае ўздзеянне самой музыкай верша і мнагазначнасцю паэтычнага слова» [1, с. 402], меладычнасць мастацкага твора мае прамое дачыненне да эстэтычнага пераасэнсавання рэчаіснасці. Сімвалізм валодае прагнастычнымі магчымасцямі, і музыка яму ў гэтым спрыяе ў поўнай меры. Прычына ў тым, што мелодыя ўтвараецца з гукаў, кожнаму з якіх у літаратуры надаецца колеравая характарыстыка. Нездарма ў свой час А. Рэмбо звязваў кожны гук з пэўным колерам.

Вялікае значэнне для сімвалісцкай па скіраванасці творчасці Янкі Купалы пачатку – сярэдзіны XX ст. мае ўплыў імпрэсіяністычных тэндэнцый, выяўленых у пленэры (святлопаветраным эфекце), фіксацыі «спыненага імгнення», сугестыўнасці, мажорным ці мінорным настроі твора. А сам феномен сімвалізму звязаны з візуальнай і аўдыяльнай формай успрымання твораў і адметнай мысленчай пераапрацоўкай сімвала праз прызму перажывання, эмоцыі і, безумоўна, рэфлексіі.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Борев, Ю. Б. Эстетика. Теория литературы: энцикл. словарь терминов / Ю. Б. Борев. – М.: ООО «Изд-во Астрель»; ООО «Изд-во АСТ», 2003. – 576 с.

2. Васючэнка, П. В. Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм / П. В. Васючэнка. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 155 с.

3. Васючэнка, П. В. Ключавыя вобразы-сімвалы ў драматургіі Я. Купалы / П. В. Васючэнка // Янка Купала і Якуб Колас у літаратурным працэсе Беларусі: матэрыялы канф., прысвеч. 110-годдзю з дня нараджэння / МДПІ імя А. М. Горкага; рэдсавет: І. С. Шпакоўскі (рэд. і ўклад.) [і інш.]. – Мінск: 1993. – С. 18–22.
4. Гарин, И. И. Проклятые поэты / И. И. Гарин. – М.: ТЕРРА-Книжный клуб, 2003. – 848 с.
5. Клімуць, Я. І. Уводзіны ў літаратуразнаўства. Мастацкі твор / Я. І. Клімуць. – Магілёў: УА «МДУ імя А. А. Куляшова», 2010. – 53 с.
6. Кобылинский, Л. Л. (Эллис). Русские символисты / Л. Л. Кобылинский (Эллис). – Томск: Изд-во «Водолей», 1998. – 288 с.
7. Купала, Я. Адвечная песня: вершы і паэмы / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 351 с.
8. Купала, Я. Збор твораў: у 6 т. / Я. Купала. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1961. – Т. 2: Вершы і паэмы, 1908–1910. – 461 с.

*УДК 821.161.1.09“18”(092А.С.Пушкин):821.162.1(092А.Мицкевич):
821.161.3(092Я.Колас)*

# ЖАНРОВЫЙ ЭКСПЕРИМЕНТ В СЛАВЯНСКИХ ЛИТЕРАТУРАХ: А. С. ПУШКИН. «ЕВГЕНИЙ ОНЕГИН», А. МИЦКЕВИЧ. «ПАН ТАДЕУШ», ЯКУБ КОЛАС. «НОВАЯ ЗЕМЛЯ»

**С. Ф. Мусиенко**

*Минск, Республика Беларусь*
*musijenko@list.ru*

В статье актуализирован вопрос о жанровой принадлежности произведений А. С. Пушкина «Евгений Онегин», А. Мицкевича «Пан Тадеуш», Якуба Коласа «Новая земля». В результате проведённого сравнительного анализа сделан вывод о том, что эти авторы используют одинаковые и подобные принципы классического эпического романа.

*Ключевые слова:* А. С. Пушкин; «Евгений Онегин»; А. Мицкевич; «Пан Тадеуш»; Якуб Колас; «Новая земля»; жанр; повествовательное пространство; художественные приемы; принцип эпопейности; классический роман.

# GENRE EXPERIMENT IN SLAVIC LITERATURES: A. S. PUSHKIN. “EUGENE ONEGIN”, A. MICKIEWICZ. “PAN TADEUSZ”, YAKUB KOLAS. “NEW LAND”

**S. F. Musienko**

*Minsk, Republic of Belarus*
*musijenko@list.ru*

The article actualizes the question of the genre affiliation of the works of A. S. Pushkin “Eugene Onegin”, A. Mickiewicz “Pan Tadeusz”, Yakub Kolas “New Land”. As a result of the comparative analysis, it is concluded that these authors use the same and similar principles of the classic epic novel.

*Key words:* A. S. Pushkin; “Eugene Onegin”; A. Mickiewicz; “Pan Tadeusz”; Yakub Kolas; “New Land”; genre; narrative space; artistic techniques; the principle of epic; classic novel.

Размышления о природе жанра в произведениях, обозначенных в названии статьи, видимо, следует начать с вопроса: почему «Евгения Онегина» (1830) А. С. Пушкина критика и читатели назвали романом? А произведение его современника польского поэта А. Мицкевича «Пан Тадеуш» (1834) – поэмой? Почти на 100 лет позднее подобного типа стихотворный эпос появился и в белорусской литературе – «Новая земля» (1923) Якуба Коласа, его также относили к жанру поэмы. Была ли жанровая разница между ними? Видимо, нет. Все три автора стали не только